SEX=БАЛЯСЫ

# САМІ САБЕ ВАЛАЧКОВЫ

**...Вось як было раней? Добры гаспадар ставіў новую хату, а затым капаў склеп пад бульбу і два калодзежы. Адзін з халоднай вадой, другі — з гарачай. Але потым тэктанічныя пліты ссунуліся, і цяпер капаюць толькі калодзеж з халоднай вадой. Эх, губляюцца традыцыі... І тыя ж народныя прыкметы адносна надвор'я ўжо амаль што не дзейнічаюць. Хіба толькі па прынцыпе: ходзіш на працу — горача, пайшоў у водпуск — дажджы. Або памыў машыну ці вокны — залева будзе. З іншага боку, з'яўляюцца новыя прыкметы, па якіх можна дакладна меркаваць не толькі пра надвор'е, але і пра многія іншыя падзеі ў нашым жыцці. Напрыклад, калі бачыце вялікія чэргі каля кас па продажы праязных білетаў, значыць, для многіх «нечакана» надышоў новы месяц. Калі каля газетных кіёскаў шмат моладзі і ўсе набываюць чорныя гелевыя ручкі — значыць, сёння ў краіне праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне. Ну а калі загаварылі пра дрэс-код у грамадскіх месцах, выходзіць, прыйшло сапраўднае цяпло. («Надышло лета. Астролагі прадказваюць, што колькасць экспертаў у інтэрнэце ў найбліжэйшы час імкліва скароціцца, таму што іх павязуць да бабуль у вёскі».)**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вось і сёлета зноў, як толькі крыху прыпякло, пачалі гаварыць пра тое, што ў кабінет да чыноўніка ў шортах ці спартыўным адзенні не зойдзеш, бо ахоўнік можа не прапусціць. А ў больш шырокім сэнсе — пра культуру паводзінаў. («Апрані тое, у чым табе зручна». — «Але я не магу хадзіць у коўдры».) Ну як на гэта рэагаваць? Я таксама люблю хадзіць у шортах і шлёпках, але толькі ў вёсцы па сваім участку. У цэнтры горада ў такім «прыкідзе» не з'яўлюся, нават калі будуць моцна прасіць. А некага і прасіць не трэба, бо толькі так ён і можа вылучыцца. («Вось моладзь нахабная пайшла...» — «А раней як было?» — «А раней нахабнымі былі мы!») Таму абмяркоўваць гэтую тэму, прабачце, гэтак жа бессэнсоўна, як стыхійны гандаль у падземных пераходах (там таксама дапамагае толькі наяўнасць праваахоўнікаў, але ў кожным месцы іх не паставіш). Ці ўсё адно што забараніць Валачковай зноў і зноў заяўляць пра сябе.

Колішняя балерына, дарэчы, — таксама адна з «народных прыкмет», якая «працуе» круглы год. Там, дзе яна, заўсёды эпатаж. То Валачкова здымаецца ў бікіні, то без яго... («Ёсць такія жанчыны, якія з гонарам заяўляюць: «Я адна такая!» Глядзіш на яе і думаеш: «І слава Богу!») Вось нядаўна яна стала галоўнай «зоркай» моднага паказу — прайшлася па подыуме ў купальніку. Ды так, што Бары Алібасаў, які сядзеў у першым радзе, ледзь не выпаў з крэсла, спрабуючы сфатаграфаваць эфектна адтапыраную «пятую кропку» Валачковай. («Нехта створаны для кахання, хтосьці — для вялікіх подзвігаў. Ну, а іншы — выключна для таго, каб навакольныя маглі пасмяяцца».) Як гаварыў барон Мюнхгаўзен: «Дачка аптэкара — яна і ёсць дачка аптэкара». Прабачце, прыхільнікі таленту (ці чаго там яшчэ?) колішняй прымы. Як у тым анекдоце? «Я вырас у тыя часы, калі «буцік» быў проста бутэрбродам».

**Такія паводзіны нашых прадстаўніц прыгожага полу — не болей, чым звычайнае жаночае какецтва. Ці тое самае жаданне вылучыцца, заявіць пра сябе любым спосабам.**

Вось як мне пры такім выхаванні ставіцца да такой навіны? Паведамляецца, што ў апошні час шмат дзяўчат і жанчын пачалі адмаўляцца ад макіяжу ці скарачаць карыстанне касметыкай да мінімуму, каб выглядаць больш натуральна. Фатаграфіі жаночых твараў без макіяжу запоўнілі ўсе сацыяльныя сеткі (ну куды ж без іх). («Вадзік, а ты мяне не палохаешся, калі я без касметыкі?» — «Калі быць зусім шчырым, Люся, дык я цябе і з касметыкай пабойваюся».) У процівагу з'явіўся новы флэшмоб, удзельніцы якога не бачаць нічога страшнага ў тым, каб карыстацца касметыкай («Мне здаецца, што галоўнае правіла, калі малюеш брыво, — гэта своечасова спыніцца».) Усё пачалося пасля таго, як 21-гадовая візажыстка з Нідэрландаў выклала ў сеціве (вы заўважаеце, як усё напаказ?) фота і відэа, дзе яна нанесла макіяж толькі на палову твару. І панеслася... Ідэю падхапілі іншыя прадстаўніцы прыгожага полу і пачалі запаўняць свае старонкі такімі ж фотаздымкамі. І мне, як «чалавеку старой фармацыі» (словы Д'Артаньяна), адразу прыгадаўся Высоцкі: «Я не люблю, когда — наполовину/, Или когда прервали разговор/, Я не люблю, когда стреляют в спину/, Я также против выстрелов в упор»... Можна і больш мякка, але сэнс будзе такім жа. Памятаеце, як казаў Фіма з фільма «Госця з будучыні»: «У вашым узросце пара навучыцца маніць як след. Што за аматарства: я не бачыў, я не гаварыў...»? Гэта я да чаго хілю? Такія паводзіны нашых прадстаўніц прыгожага полу — не болей чым звычайнае жаночае какецтва. Ці тое самае жаданне вылучыцца, заявіць пра сябе любым спосабам. («Не маюць рацыі тыя, хто сцвярджае, што жанчыны самі не ведаюць, чаго яны хочуць. Выдатна ведаюць. Яны бачылі гэта ўчора ў краме...») Тым больш што самі ўдзельніцы флэшмоба ў выніку прызнаюцца: адным касметыка дазваляе адчуваць сябе больш упэўнена, іншым больш падабаецца працэс нанясення макіяжу. Што было ў выніку даказана? Відавочнае. Выйшла, як у чарговым анекдоце. «У школе. Настаўніца: «Сёння ў нас кантрольная». Бландзінка: «А можна карыстацца калькулятарам?» — «Можна». Другая бландзінка: «А табліцамі Брадзіса?» — «Можна. Так, дзеці, запішыце тэму нашай кантрольнай работы: «Адмена прыгоннага права».

...Ну, то і няхай, што дзяўчаты чарговы раз даказалі відавочнае. А чаму? Ды з тае простай прычыны, што кожная з прыгажунь можа сказаць пра сябе: «Я жанчына і таму кажу сваё рашучае «можа быць»... Гэта адна з самых дакладных «народных» прыкмет. Праверана.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Трэба верыць у свае сілы!»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

*Захапленне музыкай у кожнай з іх пачалося ў дзяцінстве, калі яны — з расчоскай альбо дэзадарантам замест мікрафона — ладзілі выступленні дома: уяўлялі вялікую сцэну і залу, поўную гледачоў. Потым па класічным сцэнарыі: наведванне музычнай школы, паступленне ў каледж, інстытут, дзе музыка была і застаецца іх нязменным спадарожнікам...*

**Таццяна:** Іграю на фартапіяна, акардэоне і трохі на цымбалах. Але, ведаеце, я ніколі не думала, што буду пісаць музыку. У нас быў прадмет «Аналіз музычных формаў», які па складанасці можна параўноўваць з вышэйшай матэматыкай, таму і адчуванне многіх тонкасцяў прыйшло з часам. Потым аднойчы напісаны мной твор паслухаў паэт Іван Цітавец (ён працуе ў суаўтарстве з Ігарам Лучанком) і даў яму паглядзець на маю работу. Не скажу, быццам я вялікі майстар у такой справе, але імкнуся ў сваіх мелодыях дзяліцца часцінкай сваёй душы, расказваць пра свае пачуцці. У выніку я напісала гімн Траецкаму прадмесцю, які выконвае ансамбль «Свята». І гэта прыемна, калі можаш рэалізоўвацца і як малады кампазітар. Пішу музыку ў патрыятычным стылі для класічных і народных хораў.

**Таісія:** А ў мяне ўсё пачалося з таго, што я прыйшла да бацькоў і сказала: пайду вучыцца ў музычную школу (чым спачатку шакіравала іх). Але калі ўжо я сама была гатова ўсё кінуць, менавіта бацька адгаварыў мяне ад гэтага кроку. Ён хацеў, каб я спявала, займалася музыкай і развівалася ў гэтай сферы. Зараз я паралельна працую яшчэ ў адной групе, якая грае фолк — мы выконваем беларускія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы ў суправаджэнні кантрабаса, гітары, флейты, баяна, джамбэя...

***— Як вашы бацькі паставіліся да жадання зрабіць музыку прафесіяй?***

**Таццяна:** У мяне маці — фармацэўт-правізар, таму заўсёды казала, што вучыць хімію і займацца адкрыццём новых лекаў — вельмі важная і запатрабаваная праца. Спрабавала туды мяне накіроўваць, але з часам я заўважыла, як мне падабаецца разблытваць розныя невядомыя сітуацыі (я сябравала з кампаніяй хлопцаў) і захацела стаць следчым. З узростам, праўда, пачала думаць пра тое, ці жаночая гэта справа? Прыехала ў Мінск, наведвала курсы МУС і ўжо разумела, што змагу паступіць... Але ў апошні момант вырашыла падаць дакументы ва Ўніверсітэт культуры. Дома пра маё месца вучобы даведаліся толькі праз паўгода, але я зусім не шкадую аб здзяйсненні сваёй мары.

**Ганна:** Я ніколі не ўяўляла сябе ні ў якой іншай прафесіі. Нават у радзільным доме так гучна крычала, што ўрачы сказалі маці: верагодна, дачка ў вас будзе спявачкай. Мае бацькі мяне падтрымліваюць.



**Марына:** У мяне і бацька з маці, і бабуля (якая спявала ў народным хоры) хацелі, каб я займалася музыкай. Таму з таго часу, як мяне за руку прывялі ў музычную школу, музыка стала асноўным заняткам у маім жыцці.

***— Раскажыце пра свае музычныя густы...***

**Таісія:** Мой выбар музыкі залежыць ад настрою. Калі мне весела, то паслухаю нешта з такіх жанраў, як фанк і скай, а як раптам сумна робіцца, то ўратаваць зможа нешта рокавае (Led Zeppelin, Deep Purple). Люблю басанову, калі гаварыць пра тых, у каго можна нечаму павучыцца, то тут — імёны Білі Холідэй, Селін Дыён, якая проста нешта неверагоднае робіць на канцэртах голасам.

**Ганна:** Я аддаю перавагу эстраднай музыцы, таму мне імпануе творчасць такіх выканаўцаў, як Pink, Beyonce, Maroon 5. Люблю вельмі джазавую музыку, бо на ёй я вучылася.

**Марына:** З задавальненнем слухаю Christina Aguilera, Beyonce, але, бывае, і Білана магу ўключыць...

**Таццяна:** Я таксама прыхільніца розных стыляў у музыцы. І вельмі важна якраз тое, дзе я магу нешта пачарпнуць для сябе як выканаўца. Таму на выбар песень уплываюць не толькі ўласныя густы, але і наяўнасць у іх цікавых новых хадоў. На расійскай эстрадзе мне падабаюцца Паліна Гагарына, Валерый Меладзэ, Леанід Агуцін, Пелагея. Сярод замежных выканаўцаў мае любімыя — Bon Jovi, Christina Aguilera, Beyonce, Shakira. Мне падабаецца, калі ў артыста пазнавальны голас. А пры жаданні расці і развівацца прафесійна і густы музычныя мяняюцца.

***— А якую дзяўчыну можна лічыць у наш час прыгожай?***

**Ганна:** Натуральную, без любога хірургічнага ўмяшання. Дзяўчаты (і мы не выключэнне) бачаць у інтэрнэце шмат інфармацыі пра тое, як даглядаць сябе, і імкнуцца да гэтага. Аднак галоўнае — прымаць сябе такой, якая ты ёсць.

**Таццяна:** Наконт прыгажосці скажу як чалавек, які пісаў па гэтай тэме дыпломную працу. Знешнасць нічога не вартая без унутранага напаўнення. Нават дзеці пішуць пра тое, што ляжыць змейка, і ў яе прыгожая лускавінка, але ўнутры яна ядавітая. Ці цукерка ў прыгожай абгортцы — не заўсёды смачная. Таму, на мой погляд, аснова — якраз прыгажосць унутраная. Паверце, яна абавязкова знойдзе адлюстраванне ў знешняй.

***— Як гераіні прыгожай гісторыі, што можаце параіць тым, хто таксама марыць быць на сцэне?***

**Таісія:** Самы галоўны мой здабытак на праекце Milki — вера ў сябе. Я набыла ўпэўненасць у тым, што магу дзяліцца чымсьці з іншымі. Таму не бойцеся набіваць гузакі. Вас могуць ацаніць адразу альбо доўга не заўважаць увогуле, але аднойчы абавязкова здарыцца ў вашым жыцці нешта грандыёзнае.



**Ганна:** Нічога не бойцеся і не станавіцеся крытыкамі на канапе. Бо бывае вельмі непрыемна натыкацца на заўвагі людзей, чытаючы якія разумееш: чалавек не рэалізаваўся ў жыцці і яму не застаецца нічога, як сядзець і «выказвацца».

**Таццяна:** Мары аднойчы абавязкова здзяйсняюцца, калі не апускаць рук, верыць у свае сілы і ісці да мэты. А калі вы станеце паспяховымі, то зможаце перадаць прывітанне ўсім тым, хто ў вас не верыў!

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.569.
Нумар падпісаны ў 19.30 22.07.2015 г.